Кацічава В.Ю., студ. гр.450 ФІДК
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Бяспалая М.А.,
доктар гістарычных навук, прафесар

# АСНОЎНЫЯ ЭТАПЫ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВАЎКАВЫСКАГА ВАЕННА-ГІСТАРЫЧНАГА МУЗЕЯ ІМЯ П.І. БАГРАЦІЁНА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навукова-даследчая дзейнасць у музеі з’яўляецца асноўнай і вызначаючай. На прыкладзе дзейнасці Ваўкавыскага ваенна-гістарычнага музея імя П.І.Баграціена, з выкарыстаннем матэрыялаў музейных справаздач, канферэнцыі, хацелася б раскрыць навукова-даследчую працу супрацоўнікаў, яе развіцце і сучасны стан.

На пачатку існавання музея ў 1940 годзе навукова-даследчая праца была не сістэматычнай, аднак пачынаючы з 1949 года артыкулы аб дзейнасці музея і яго супрацоўнікаў становяцца рэгулярнымі. Абсалютная большасць артыкулаў у перыяд з 1950 па 1965 гады напісана тагачасным дырэктарам музея Г. І. Пехам. Сярод самых актыўных аўтараў публікацый – А.П. Чарныш, які з’яўляўся дырэктарам музея з 1986 па 1998г. Актыўна друкаваліся навуковыя супрацоўнікі музея Дудзін М.І.,Асіпенка Я. Л., Патапёнак Г. Ф.

З 1999 па 2001 гады ў раённай газеце «Наш час» у працяг традыцыі рэгулярна друкаваліся артыкулы новага дырэктара музея Алены Леанідаўны Ярашэвіч, а таксама старшага навуковага супрацоўніка музея Аллы Іванаўны Суеты. Адзіным спецыяльным выданнем, якое цалкам прысвечана Ваўкавыскаму ваенна-гістарычнаму музею імя П. І. Баграціёна, з’яўляецца даведнік, складзены навуковым супрацоўнікам гэтай установы Мікалаем Іванавічам Дудзіным і выдадзены ў 1987 годзе. У даведніку вельмі падрабязна апісваюцца ўсе шэсць залаў музея і прадстаўленыя там экспанаты, але гісторыі самага музея ў даведніку адводзіцца ўсяго некалькі абзацаў тэксту.

Акрамя даведніка М. І. Дудзіна, звесткі пра гісторыю і дзейнасць музея імя  П. І. Баграціёна можна знайсці ў спецыяльным навукова-папулярным выданні «Ваўкавышчына: з гісторыі краю і лёсаў людзей» і выйшла з друку ў 1997 г.. Гэта самае найноўшае і сістэматызаванае апісанне гісторыі стварэння, асноўных этапаў дзейнасці і  бліжэйшых перспектываў развіцця музея ў Ваўкавыску, якое патрабуе, аднак, удакладнення і дапаўнення.   На працягу некалькіх гадоў і(1998-2004г.г.) музей знаходзіўся у занядбаным стане, ў сувязі з рэканструкцыяй, дэманціраваннем старой экспазіцыі і працай над стварэннем новай. Таму асноўная дзейнасць  музейных супрацоўнікаў ішла ў рэчышчы навукова-даследчай працы. Вынікі навукова-даследедчых пошукаў Ваўкавыскага ваенна-гістарычнага музея за апошнія пяць год дапамагаюць аб'ектыўна ацаніць дзейнасць музея на дадзеным этапе.

***2005г.*** Найбольш насычаны на падзеі і разнастайны па накірунках музеязнаўчай работы год. Музей працаваў у даволі складаных умовах, пастаяннай экспазіцыі не было , таму асноўны накірунак - выставачная дзейнасць. За год было арганізавана 17 выстаў, 5 з якіх зроблены з уласных фондаў. Да юбілейнай даты з дапамогай супрацоўнікаў ГДГАМ былі створаны дзве стацыянарныя выстаўкі- “Старажытны Ваўкавыск” і “Вайна 1812 г.”. Адбыліся таксама сустрэчы з удзельнікамі і відавочцамі Вялікай Айчыннай вайны, запісаны іх успаміны.

Музейныя супрацоўнікі прымалі ўдзел у навуковых канферэнцыях, выступалі па радыё і ў друку. Да 1000-годдзя Ваўкавыска на працягу года у газеце  “Наш час” публікаваўся шэраг артыкулаў па гісторыі горада. Разам з выдавецкім таварыствам “Кавалер Паблішэрс” супрацоўнікі музея прымалі ўдзел у стварэнні камплекта паштовак “ Ваўкавыск у дыялогу стагоддзяў”. 23 верасня адбылася навукова-краязнаўчая канферэнцыя , прысвечаная 1000-годдзю горада. Музей быў адным з яе арганізатараў.У канферэнцыі прымалі ўдзел навукоўцы з Мінска,Гродна, краязнаўцы і гісторыкі Ваўкавышчыны, а таксама супрацоўнікі музея.У дадзеным годзе была праведена праца па

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

складанню экскурса па турыстычнаму маршруту дварцова-паркавых ансамбляў раёна “Падароск-Гнёзна-Цеалін-Рось”.

***2006г.*** У дадзеным годзе нарэшце была створана новая экспазіцыя, музей пачаў працаваць у больш камфортных і зручных умовах: 6 студзеня музей атрымаў статус юрыдычнай асобы, а ў верасні- ліцэнзію на захаванне зброі і вырабаў з каштоўных металаў і камянёў. Галоўнай задачай у галіне навукова-даследчай работы музея было стварэнне новай экспазіцыі раздзела “Ваўкавыск ў другой сусветнай вайне”. У ліпені 2006 г. адбылася экспедыцыя супрацоўнікаў музея  па збору экспанатаў у вескі Ваўкавыскага раёна.

***2007г.*** У гэтым годзе музей даволі інтэнсіўна і плённа  праводзіў дзейнасць у сферы навукова-даследчай працы. У пачатку года была распрацавана новая тэматычная экскурсія, тэматыка-экспазіцыйны план выстаўкі “Знакамітыя імены Ваўкавышчыны”. Ішла работа над распрацоўкай новых тэм лекцый: “З гісторыі 2-й Заходняй Арміі”, “Нумізматычныя помнікі вайны 1812г.”, “Ваўкавыскі бой”( да 195-годдзя вайны 1812г.). Галоўны захавальнік фондаў Калініна І.М. аказала метадычную дапамогу супрацоўніку АН Лавыш К.А. пры адборы музейных экспанатаў з калекцыі “ Археалогія” для напісання навуковай працычна тэму: “Художественные традиции восточной и византийской культуры в искусстве средневековых городов Беларуси 10-14 вв..” У кастрычніку 2007 г. галоўны захавальнік фондаў Калініна І.М. прыняла удзел у семінары, які праводзіў Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей па тэме: “Экспазіцыйна-выставачная работа- адзін з накірункаў музейнай дзейнасці”.

***2008г.*** У 2008 г.супрацоўнікамі музея былі распрацаваны тры маршрут-тура:”Волковысская сокровищница”, ” Краски родной земли”, “Духовное наследие  Волковысчины”. Таксама разам з Ваўкавыскім райвыканкамам быў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выдадзены буклет “По берегам Росси и Волковыи…”, у якія увайшлі гэтыя тэмы. Была распрацавана новая тэматычная экскурсія і тэматыка-экспазіцыйны план выстаўкі “Абавязак,гонар, слава”(да 90-годдзя Савецкай Арміі).

***2009г.***Да 65-годдзя вызвалення Беларусі ад пачатку года вялася распрацоўка тэматыка-экспазіцыйнага плану выстаўкі “ Доля, абпаленая вайной”.Актыўна і на працягу года супрацоўнікі музея займаліся падрыхтоўкай матэрыялу да выдання буклета “ Ваўкавыскі ваенна-гістарычны музей імя П.І. Баграціёна”, а таксама буклета на тэму “ Каталіцкія і праваслаўныя храмы Ваўкавышчыны”. Супрацоўнікі накіроўваліся ва ўжо традыцыйныя экспедыцыі і камандзіроўкі.

Такім чынам, прааналізаваўшы навукова-даследчую працу ваўкавыскага музея, можна прыйсці да высновы, што нягледзячы на шматлікія цяжкасці і перашкоды, недахоп супрацоўнікаў (іх усяго тры), навуковае жыццё у музеі развіваецца, яно шматнакіраванае, цікавае. Навуковыя дасягненні музейных супрацоўнікаў знаходзяць сваё практычнае увасабленне.

Літаратура:


1. Ваўкавышчына: з гісторыі краю і лёсаў людзей: // Матэрыялы навукова-практычнай краязнаўчай канферэнцыі 22 снежня 1995 года / Інстытут гісторыі АН Беларусі. Кафедра гіст. Беларусі ГрДУ імя Я. Купалы. – Ваўкавыск, 1997. – 267с.
2. Волковысский военно-исторический музей имени П.И.Багратиона: Путеводитель по залам / Н. И. Дудин. – Минск: Полымя, 1987. – 94с.
3. Отчёт о работе музея за 2005г. – 8л.
4. Отчёт о работе музея за 2006г. – 8л.
5. Отчёт о работе музея за 2007г. – 8л.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Отчёт о работе музея за 2008г. – 8л.

Отчет о работе музея за 2009г.- 8л.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ